Балуканіце В.С., студ.гр. 415а ФТБКіСМ
БДУКМ
Навуковы кіраўнік – Гулак А.А.,
ст. выкладчык

# МІФАПАЭТЫКА БАБРА Ў ТРАДЫЦЫЙНАЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСАЎ: КРАЯЗНАЎЧЫ І ЛІНГВІСТЫЧНЫ АСПЕКТ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Многія прадстаўнікі фауны, таксама як і адзінкі расліннага свету, у традыцыйнай народнай культуры набылі семіятычны статус. Вывучэнне знакавай прыроды аб’ектаў навакольнага свету адкрывае новыя пласты архаічных вераванняў славян і з’яўляецца вельмі перспектыўным.

З цягам часу, набыў семіятычны статус і распаўсюджаны некалі ў Беларусі пушны звярок, жыхар ціхіх лясных вадаёмаў, бабёр. «Бабёр займае значнае месца ў духоўнай спадчыне беларусаў і выступае як сімвал многіх аспектаў жыцця чалавека» [2, с. 35]. У міфалагічнай карціне свету славяне змясцілі бабра ў ніжнім ярусе, у воднай прасторы, але побач з яварам, Сусветным дрэвам. «Бабёр сімвалізуе багацце, дабрабыт, здароўе — babровае футра, шапка часта выкарыстоўваюцца як вобраз багацця ў вянчальна-віншавальных валачобных песнях. Бабёр лічыўся сімвалам мужчынскага пачатку, вобразам жаніха ў парах» [2, с. 36].

«У многіх славянскіх мовах Бабёр рыфмуецца з «-дабро»: «Усе бабры — дабры, адна выдра ліхая», «Хто заб’е бабра, таму не будзе дабра» ды інш. Апошняе выслоўе адлюстроўвае нашу рэальнасць, калі бабры, бабровыя гоні ахоўваліся законам» [2, с. 36]. Згодна Статута ВКЛ 1588 г. (раздзел 10, арт. 9) за кожнага забітага карага бабра назначалася плата 2 капы грошай, а за чорнага — 4 капы. «Забарона лавіць, забіваць чужых баброў, разбураць іх паселішчы ці зганяць з месцаў пражывання, ведучы блізка сельскагаспадарчую дзейнасць, вызначалася пісаным законам, але мела і міфалагічную матывацыю: злоўлены Бабёр плача («плача, як бабёр»), яго пакуты адгукаюцца крыўдзіцелю — Бабёр «пераплача» ўсю сям’ю таго, хто яго злавіў , сям’я вымрэ» [2, с. 36].

Тое, што Бабёр займае канкрэтнае месца як сімвал многіх аспектаў жыцця чалавека, пацвярджаецца дадзенымі тапанімікі. Як сведчаць даследчыкі, тапонімы даюць карысную інфармацыю пра этнагенетычныя працэсы, гістарычныя падзеі, лакальныя з'явы культуры і прыродныя асаблівасці пэўнай мясціны. Бабёр ушаноўваўся індаеўрапейцамі, карэннымі народамі Паўночнай Амерыкі  і Заходняй Сібіры. У Беларусі, відавочна, самай выразна матываванай з'яўляецца назва горада Бабруйск. Звернем увагу на пасёлак гарадскога тыпу Бобр, шмат беларускіх вёсак маюць назвы Бобр, Бабры, Стары Бобр, Бобрык, Баброўка, Баброва, Бабровічы, Баброўнікі, Баброўня, Бабруйшчына, Бабраняты. Маюцца на тэрытрорыі Беларусі і «бабровыя» гідронімы: рэкі Бобр, Бобрык, Бабруйка, азёры Бобрыца, Бабровічскае.

Самы буйны населены пункт на тэрыторыі Беларусі, які носіць назву, матываваную лексемай бабёр — горад Бабруйск. Летапісны Бобровск, Бобруеск, Бобрусек, Бабруйск узгадваецца ў пісьмовых крыніцах з 1387 г. (дагаворная грамата князя Літоўскакга і Рускага Ягайлы і яго брата Скірыгайлы). [3, с. 5] Бабруйск з'яўляўся цэнтрам Бабруйскай воласці. Такі парадак кіравання захоўваўся да другой паловы XVI ст. «Цэнтрам абароны горада і яго адміністрацыйным цэнтрам з'яўляўся Бабруйскі замак, які існаваў у XIV-XVIII ст. на высокім правым беразе р. Бярэзіны, непадалёку ад зліцця яе з р. Бабруйкай» [4, с. 199]. Пад час вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654-1667 гг. Бабруйскі замак быў спалены казацкімі войскамі. У 1807-1836 гг. на месцы былога замка была пабудавана Бабруйская крэпасць. Наконт паходжання назвы горада бытуе некалькі версій. Па-першае, зафіксаваны паданні, якія сведчаць аб тым, што назва горада ўтварылася ад імя храбрага мужа, абаронца сваёй малой радзімы.

Адзначым, што гіпотэзы аб утварэнні назваў населенных пунктаў ад імёнаў гераічных асоб ці заснавальнікаў, даволі пашыраныя ва ўсходніх славян і далёка не заўсёды пацвярджаюцца навуковымі дадзенымі. Па-другое, можна меркаваць, што ў назве горада ёсць адгалосак старажытнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

промысла, бо прыкладна на тым самым месцы, дзе зараз стаіць Бабруйск, у IX-XI стст. было паселішча, жыхары якога займаліся, галоўным чынам, паляваннем на баброў і рыбалоўствам. Па-трэцяе, назва горада магла ўтварыцца ад назвы ракі. Горад і Бабруйскі замак пабудаваны на беразе ракі Бабруі (зараз Бабруйка), адкуль пайшла назва горада. На беларускай этнамоўнай тэрыторыі, лічыць В. П. Лемцюгова, назвы паселшчаў на -ск часта ўтвараюцца на базе гідронімаў. [5, с. 53] Некаторыя даследчыкі лічаць, што назва ракі Бабруя мае блізкае паходжанне, і сэнс гэтага гідроніма, пакуль што, не вызначаны. А гэта азначае, што, магчыма, паходжанне назвы горада Бабруйска навогул не звязана з бабрамі. Тым не менш, Бабёр стаў сімвалам горада. У 1988 г. Бабруйску быў нададзены герб, на якім знайшлося месца і стылізаванай выяве Бабра. (Гэты герб быў зменены ў 2005 г.) І 9-га верасня 2006 г. у цэнтры горада быў устаноўлены помнік Бабру. На наш погляд, развіццё і пашырэнне ў сацыяльна-культурнай сферы горада і раёна лакальнай традыцыі, звязанай з жывёлай-бабром, перспектыўнае, бо ўзбагачае культурнае асяроддзе, выхоўвае ў гараджанаў любоў да сваёй малой радзімы.

Як сведчаць лінгвістычныя даследаванні, нельга сцвярджаць, што ўсе «бабровыя» тапонімы ўтварыліся непасрэдна ад назвы прадстаўніка беларускай фауны. Нярэдка да таго, як агульны назоўнік у выніку эвалюцыі семантыкі ператвараецца ў тапанімічную назву, на нейкім прамежкавым этапе ён выконвае ролю ўласнага назоўніка. Не выключана, што такія назвы, як Баброўшчына, Бабровічы, Бобрыкі ўтварыліся ад мянушак ці ўласных старажытнаславянскіх імёнаў Бобр, Бобрык і інш., якія належалі заснавальнікам названых паселішчаў. «У XV – XVII ст. ст. побач з уласнымі асабовымі імёнамі хрысціянскага календара ўжываліся імёны-мянушкі апелятыўнага паходжання. Імёны-мянушкі ў час іх узнікнення заўсёды маюць пад сабой які-небудзь рэальны факт. Часта яны характаразуюць асобу па знешняму выгляду ці характару» [1, с. 81-82]. Гэта датычыцца ўласных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

старажытнаславянскіх імёнаў, многія з якіх утварыліся ад назваў жывёл, раслін, увасобілі ў сабе пэўныя характарастыкі.

Ад мянушак і дахрысціянскіх імёнаў утварыліся многія прозвішчы. Не сталі выключэннем і «бабровыя» антрапонімы. Так, у гістарычных крыніцах зафіксаваны наступныя ўсходнеславянскія прозвішчы: Бобр, Бабёр, Бобер, Баброў, Бабровіч, Бобрык, Бобрыкаў, Бабрук, Бабракоў, Бабярэц, Бабрыцкі. Да сучасных беларускіх прозвішчаў старажытнага паходжання даследчыкі адносяць наступныя антрапонімы: Бобр, Бобрык, Бобер, Бабёр.

Такім чынам, можна адзначыць, што міфапаэтыка бабра ў беларускай народнай традыцыйнай культуры мае даволі развітую семантыку. Гэта абумоўлена тым, што міфалагічны светапогляд уключае асэнсаванне прыроднага асяроддзя чалавека і яго працоўных практык. У вывучэнні праблем міфапаэтыкі карысныя не толькі дадзеныя фальклорных тэкстаў, але і звесткі з лінгвістыкі (тапанімікі, антрапанімікі), гісторыі і краязнаўства.

Спіс выкарыстанай літаратуры:

1. Беларуская антрапанімія/ М. В. Бірыла. — Мінск: Навука і тэхніка, 1966. — 328 с.

2. Беларуская міфалогія: Энцыклапедычны слоўн./ С. Санько [і інш.]; склад. І. Клімковіч. — 2-ое выд., дап. — Мн.: Беларусь, 2006. — 599 с.: іл.

3. Летапіс горада на Бярэзіне (1387-1917)/ Ненадавец А. М. — Мн.: Выш. шк., 1998. — 151 с.: іл.

4. Падарожжа па Беларусі: Гарады і гарадскія паселкі/ Вольга Князева. — Мн.: Беларусь, 2005. — 303 с.: іл.

5. Тапонімы распавядаюць: навукова-папулярныя эцюды/ В. П. Лемцюгова. — Мінск: Литература и Искусство, 2008. — 416 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ